А.У. Бубнова,
метадыст аддзела падтрымкі і развіцця
культурна-адукацыйных ініцыятыў
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Выкарыстанне банка даных таленавітай моладзі Рэспублікі Беларусь у інфармацыйным забеспячэнні ўстаноў адукацыі сферы культуры

У 2005 г. Кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб стварэнні электроннага банка даных таленавітай моладзі Рэспублікі Беларусь (далей — банк даных), які сёння з'яўляецца аўтаматызаванай сістэмай цэнтралізаванага ўліку, назапашвання і фіксацыі інфармацыі аб стыпендыятах, дыпламантах і лаўрэатах фонду, што адрозніваюцца асаблівымі здольнасцямі і паказалі значныя вынікі ў творчай дзейнасці [1].

Палажэнне аб электронным банку даных таленавітай моладзі, зацверджанае Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 8 ад 6 красавіка 2006 г., вызначае парадак стварэння, вядзення і падтрымання ў актуальным стане існуючай у ім інфармацыі.

Банк даных вядзецца ў мэтах:

збору, сістэматызацыі і захавання інфармацыі аб стыпендыятах, лаўрэатах і дыпламантах спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі;

забеспячэння адзінай сістэмы ўліку маладых талентаў і прыцягнення іх да творчых мерапрыемстваў;

інфармавання дзяржаўных органаў, устаноў культуры і мастацтва, адукацыі, іншых зацікаўленых асоб аб творчых дасягненнях таленавітай моладзі;

аказання дапамогі ў арганізацыі навучання адоранай моладзі, яе прафесійнай арыентацыі;

удасканалення сістэмы работы з таленавітай моладдзю.

У банк даных уключаюцца звесткі аб грамадзянах краіны, замежных грамадзянах і асобах без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі, ва ўзросце да трыццаці аднаго года, якім прысуджаны заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, якія з'яўляюцца пераможцамі (Гран-пры, I, II, III месца, дыпломы I, II, III ступені) міжнародных і рэспубліканскіх мастацка-творчых мерапрыемстваў, тэле- і радыёпраектаў.

Фарміраванне і вядзенне банка даных таленавітай моладзі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе Інбелкульт.

У 2007 г. банк даных быў унесены ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў (рэгістрацыйнае пасведчанне № 1130700505 ад 20 чэрвеня 2007 г. са зменамі ад 17 лютага 2011 г.).

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння ў рэспубліцы дзейнічае шэраг нарматыўных прававых актаў, накіраваных на эфектыўнае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, пры гэтым працягваецца работа па ўдасканаленню прававой базы, якая рэгулюе адносіны ў сферы інфарматызацыі.

Курс краіны на пабудову інфармацыйнага грамадства знайшоў адлюстраванне ў Канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне інфарматызацыі, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 красавіка 1999 г. № 195 «О некоторых вопросах информатизации в Республике Беларусь».

Асноўная мэта канцэпцыі — пабудова інфармацыйнага грамадства; забеспячэнне пераходу да новага этапу развіцця краіны праз стварэнне адзінай інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай прасторы рэспублікі, як базы для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця краіны і арганізацыі яе бяспекі.

Пашырэнне і распаўсюджанне інфармацыйных тэхналогій немагчыма ўявіць без рэалізацыі адпаведных дзяржаўных праграм. Так, першая буйная праграма — «Электронная Беларусь» (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2002/12/27 г. № 1819) была накіравана на фарміраванне ў краіне адзінай інфармацыйнай прасторы для павышэння эфектыўнасці функцыянавання эканомікі, дзяржаўнага і мясцовага кіравання.

26 красавіка 2010 г. Кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ № 199 «О некоторых вопросах формирования, ведения и использования банков данных одаренной и талантливой молодежи» ў мэтах забеспячэння эфектыўнага выкарыстання творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу адоранай і таленавітай моладзі, аказання дапамогі ў яе прафесійнай дзейнасці, для рэалізацыі якіх зацверджана Палажэнне аб парадку фарміравання, вядзення і выкарыстання банкаў даных адоранай і таленавітай моладзі і прынята рашэнне аб інтэграцыі банкаў даных у агульнадзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму (далей — ААІС), што дазваляе атрымліваць доступ кадравым службам дзяржаўных органаў і іншым арганізацыям да інфармацыі, якая змяшчаецца ў банках даных.

Функцыі аператара ААІС выконвае Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг» у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2011 г. № 515 «О некоторых вопросах развития информационного общества в Республике Беларусь».

ААІС забяспечвае прадастаўленне юрыдычным і фізічным асобам электронных паслуг на «Адзіным партале электронных паслуг», які функцыянуе ў сетцы інтэрнэт; для органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных і іншых арганізацый — на інтранэт-партале ААІС, які даступны ў рамках выдзеленай сеткі перадачы даных.

Электронныя паслугі ААІС рэалізуюцца на аснове інфармацыі базавых і іншых дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, інтэграваных у ААІС і прадастаўляюцца на ўмовах, якія вызначаюцца ўладальнікамі інфармацыйных рэсурсаў. Інфармацыя захоўваецца ва ўладальнікаў.

Дзяржаўны інфармацыйны рэсурс «Банк данных талантливой молодежи Республики Беларусь», інтэграваны ў ААІС, забяспечвае доступ да інфармацыі аб грамадзянах, заахвочаных спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, органам дзяржаўнага кіравання пры фарміраванні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перспектыўнага кадравага рэзерву, а таксама для развіцця, рэалізацыі і захавання творчага патэнцыялу маладых талентаў, стварэння ўмоў для іх плённай дзейнасці.

Выкарыстанне банка даных ва ўстановах адукацыі дазваляе ўзаемадзейнічаць з дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі для суправаджэння прафесійнага росту юных таленавітых грамадзян, удасканалення сістэмы работы з адоранай моладдзю.

Грамадзяне, якія з'яўляюцца выпускнікамі дзяржаўных устаноў адукацыі, уключаныя ў банк даных, маюць права на першачарговае размеркаванне; маладыя спецыялісты з вышэйшай адукацыяй і прынятыя на працу ў арганізацыі, што фінансуюцца з бюджэту, — на павышэнне тарыфнай стаўкі (акладу) на 50 %.

Кіраўнікі дзяржаўных органаў, устаноў адукацыі і іншых арганізацый забяспечваюць стварэнне ўмоў для прафесійнага і творчага росту адораных грамадзян шляхам замацавання за імі куратарства з боку вопытных спецыялістаў, педагогаў, выдатных дзеячаў культуры; накіравання на стажыроўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі; прыцягнення да выкладчыцкай дзейнасці; прадастаўлення права пазачарговага атрымання жылога памяшкання ў інтэрнаце на перыяд навучання і іншых гарантый у адпаведнасці з заканадаўствам.

Па стану на 1 студзеня 2016 г. у банку даных змяшчаюцца звесткі аб 672 грамадзянах і аб 173 творчых калектывах.

З агульнай колькасці грамадзян, якія падлягаюць уліку:

141 чалавек — працуюць ва ўстановах культуры;

438 чалавек — навучаюцца ва ўстановах адукацыі сферы культуры *(з іх: 98 чалавек — у дзіцячых школах мастацтваў; 101 чалавек — ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі; 171 чалавек — ва ўстановах вышэйшай адукацыі; 68 чалавек — у іншых установах адукацыі)*.

У архіў банка даных занесены звесткі аб 1770 прадстаўніках таленавітай моладзі.

У Інбелкульце праводзяцца вучэбныя заняткі (лекцыі, круглыя сталы) па азнаямленню з банкам даных у межах рэалізацыі адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі (напрыклад, у межах тэм «Сацыякультурная дзейнасць у кантэксце маладзёжнай палітыкі» і «Перспектывы развіцця ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры на сучасным этапе»), аказваецца кансультацыйна-метадычная дапамога педагогам, якія працуюць з дзецьмі і моладдзю.

У адзінай інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь электронны банк даных таленавітай моладзі займае годнае месца і служыць своеасаблівым «маяком» мастацкай творчасці, з'яўляецца вынікам адлюстравання паказчыкаў велізарнай працы і дасягненняў лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іх педагогаў і ўсіх, хто дапамагае станаўленню і развіццю творчай асобы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Ігнаценка, В.Ю., Масалава, В.Т.* Работа з таленавітай моладдзю / В.Ю. Ігнаценка, В.Т. Масалава // Беларуская культура — 2015 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця / уклад. : А.Р. Гуляева, І.Б. Лапцёнак ; рэдкал. : Б.У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2016. — 319 с. — С. 189.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ